# З гісторыі  роднага краю







| І. Мінчанка | І.Р. Гарабец | Д.М. Мядзведзеў | А.Г. Макагонаў | А.Л. Генькін |
|---|---|---|---|---|

22 чэрвеня 1941 года мірная стваральная праца савецкага народа была перапынена вераломным нападам гітлераўскай Германіі. Над краінай навісла сур'ёзная небяспека. Развязваючы захопніцкую, несправядлівую вайну супраць краіны сацыялізму, гітлераўцы ставілі сваёй мэтай знішчыць Савецкую дзяржаву, аднавіць у краіне ўладу памешчыкаў і капіталістаў, знішчыць нацыянальную дзяржаўнасць і культуру свабодных народаў СССР, ператварыць савецкіх людзей у паслухмяных рабоў нямецкіх імперыялістаў. Адносіны акупантаў да беларусаў вызначаны ў плане "Ост", згодна з якім прадугледжвалася 75% рускіх, беларусаў, украінцаў фізічна знішчыць, а астатнія 25% гіератварыць у рабоў. Што Датычыцца цыган і яўрэеў, якія таксама жылі ў Беларусі, дык іх чакала поўнае знішчэнне.

Першыя месяцы вайны былі асабліва цяжкімі для Савецкай дзяржавы. Ударныя групоўкі ворага, меўшыя ў сваім саставе вялікую колькасць танкавых матарызаваных дывізій, разгарнулі імклівае наступленне. Фронт хутка набліжаўся да Хоцімска. У тыя дні ў гарадскім пасёлку не было абыякавых. Усе былі поўны рашучасці змагацца з ворагам да апошняга дыхання. Прама з райваенкамата сотні хацімчан ішлі туды, дзе адбываліся жорсткія баі. Яшчэ да прыходу нямецка-фашысцкіх войск у Хоцімскім раёне была створана па ўказанню КПБ (б) партызанская база ўзбраення і харчавання, фарміраваліся атрады. Камуністы праводзілі растлумачальную работу сярод насельніцтва, расказвалі людзям аб задачах, формах і метадах прадстаячай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.


Б. Левертаў

Хоцімскі атрад узнік з трох невялікіх груп. У адну з іх, створаную райкомам партыі, увайшлі камуністы Абрам Генькін, Андрэй Беляуш, Барыс Левертаў, Васіль Цыганкоў, Іван Мінчанка і камсамолец Пётр Ганчарэнка. У канцы кастрычніка 1941 года да іх далучыліся работнікі абласнога ўпраўлення міліцыі Васіль Сырамалотаў, Аркадзь Міліцын і начальнік Магілёўскага

раённага аддзела НКВД Павел Клімаў.

Хоцімск абараняла і з баямі адступала 21-я кавалерыйская дывізія, у састаў якой уваходзіў 112-ы горна-кавалерыйскі полк. Бязпрыкладны гераізм і стойкасць дэманстравалі савецкія воіны ў кожным баі, аднак абстаноўка заставалася цяжкай. 15 жніўня 1941 года фашысцкія войскі авалодалі Хоцімскам. 16 жніўня ў дванаццаці кіламетрах ад Хоцімска група кавалерыстаў з 25 чалавек, пакінутая для прыкрыцця, затрымала нямецкія танкавыя войскі на 5-6 гадзін, даўшы магчымасць савецкім воінам пераправіцца праз раку Іпуць. Кавалерысты на чале з Гарабцом І.Р. загінулі, але яны здзейснілі подзвіг пры адступленні, забяспечыўшы правільны адвод сіл палка.

Немцы рваліся да Масквы. А партызанскі атрад пад камандваннем чэкіста Дзмітрыя Мікалаевіча Мядзведзева ў верасні 1941 года прабіраўся за лінію фронта ў заходнім напрамку - да Мінска, знішчаючы варожыя гарнізоны, узнімаючы патрыётаў на свяшчэнную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У кастрычніку 1941 года чэкісцкі атрад Мядзведзева ўстанавіў сувязі з Хоцімскім партызанскім атрадам. Была арганізавана разведка. У разведку адправіўся Міхаіл Ерафееў. У поспеху аперацыі роля Ерафеева была вельмі цяжкай. Пад прапановай уладкавання на работу ён з'явіўся да бургамістра горада. Той прапанаваў уступіць у паліцыю, каб умацоўваць "новы парадак", і выдаў адпаведнае накіраванне, якім, як пропускам, карыстаўся партызан для выканання разведвальнага задання. Праз некалькі дзён быў зроблен налёт партызан на Хоцімскі гарнізон. Мядзведзеў разбіў абодва атрады на некалькі груп і кожнай даў пэўную задачу. Дзве групы ён накіраваў на флангі: адна з іх павінна была спаліць мост, другая - перарэзаць тэлефонную сувязь. Наступныя дзве групы партызан, па 20 чалавек кожная, былі пасланы ў паліцэйскае ўпраўленне і ў камендатуру горада. Група на чале з камісарам



**Удзельнікі абароны Хоцімска 112 горна-кавалерыйскага пал-ка (злева направа): мл. л-нт Фёдараў, м-р Румянцаў, л-нт Багда-**

Кулаковым накіравалася ў аптэку за лекамі і перавязачнымі матэрыяламі, у іх атрад меў асаблівую патрэбу. Сам Д.М. Мядзведзеў, з ім яшчэ 15 партызан, распараджаўся ў цэнтры Хоцімска. Гэта была група рэзерву. 3 наступленнем цемры партызаны ўвайшлі ў Хоцімск. Адбылася інтэнсіўная стральба. Партызаны валілі тэлефонныя слупы, разграмілі тэлефонную станцыю, тут жа захапіпі батарэі для рацыі, спалілі стамятровы мост.

Знішчэнне маста было вялікай удачай: па гэтай магістралі праціўнік пасылаў карныя атрады ў лясы для барацьбы з партызанамі. Прадукты: масла, некалькі тысяч яек, якія гітлераўцы сабраліся вывезці з горада, Мядзведзеў аддаў мясцовым жыхарам. Сярод дакументаў, узятых у нямецкай камендатуры, былі усялякія даносы на людзей, спачуваючых Савецкай уладзе і чакаючых прыходу Чырвонай Арміі. Па парадзе камісара атрада Кулакова Ерафееў узлез на самы высокі будынак ля плошчы і вывесіў чырвоны сцяг. Д.М. Мядзведзеў усхвалявана сказаў: “Няхай гэты бой будзе нашым падарункам Радзіме ў гонар 24-й гадавіны Кастрычніка. Аперацыя па разгрому Хоцімскага гарнізона 23 кастрычніка 1941 года мела вялікае значэнне. Гэта быў першы гарадок, адбіты ў захопнікаў у цяжкім сорак першым годзе. Вестка аб поспеху партызан маланкава разнеслася па ўсёй акрузе. Савецкія людзі, аказаўшыся ў акупацыі, убачылі, што ворага б’юць і ў яго тыле.

Актыўна дзейнічалі хацімчане і пасля таго, як атрад Мядзведзева пайшоў з раёна. Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю Хоцімскага атрада. Некалькі разоў партызаны ўходзілі з баямі ад карнікаў. У лютым 1942 года пачалася аблава на партызан. Пры адступленні загінуў камсамолец Ганчарэнка.

У лютым 1942 года з хоцімскімі партызанамі аб’ядналася група з трыццаці двух чалавек на чале са старшым палітруком Андрэем Макагонавым. У складзе групы таксама былі работнікі магілёўскай міліцыі: Якаў Глазшнэйдзер, Яўген Галубец, Міхаіл Кацман і Данііл Падабед. Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю атрада. Некалькі разоў партызаны з баямі ўходзілі ад карнікаў. Але, крыху пагадзя, зноў падалі зваленыя гіартызанскімі кулямі гіглераўцы, зноў грымелі выбухі на камунікацыях ворага.

Поспеху дыверсій садзейнічаў вопыт інструктара-падрыўніка Абрама Генькіна, які ў самым пачатку вайны закончыў спецыяльныя курсы, арганізаваныя ЦК Кампартыі Беларусі ў мястэчку Чэнкі на Гомельшчыне.

Фашысты ў Хоцімску ўстанавілі свой "новы парадак". Фашысцкія каты знішчалі насельніцтва, рабавалі, катавалі, падверглі масаваму знішчэнню савецкую інтэлігенцыю, савецкі і партыйны актыў, рабочых, калгаснікаў, членаў сем’яў ваеннаслужачых. Робячы масавыя арышты, гестапаўцы ўводзілі савецкіх людзей да супрацьтанкавага рову на ўскраіне гарадскога пасёлка і ў сад мясцовай бальніцы, дзе размяшчалася камендатура. Там каты падверглі сваіх ахвяр страшэнным пакутам і катаванням -| мучылі распаленым жалезам, зарывалі ў зямлю, рабілі масавыя расстрэлы. Прычым пад страхам смяротнай кары забаранялася родным і блізкім хаваць забітых.

4 верасня 1942 года ў Хоцімску адбылася страшэнная трагедыя: нямецкія вылюдкі сабралі ўсё яўрэйскае насельніцтва Хоцімска - каля 700 чалавек і на працягу некалькіх гадзін расстрэльвалі іх з аўтаматаў. Перад расстрэлам асуджаныя на смерць падвяргаліся зверскаму збіванню, аб чым сведчылі барвова-сінія палосы на спінах раздзетых нагала перад пакараннем людзей. Грудных дзяцей, малых каты зарывалі ў зямлю жывымі або дабівалі ўдарамі прыкладаў. Доўга яшчэ варушылася зямля над гэтай брацкай магілай. У паэме

"Лёўка" наш зямляк паэт Міхаіл Карпенка пісаў: "Нас Хотимск встретил Шумом, криком, воем.
Прижал к земле
И растворил нас ад.
Вели понурых узников
С конвоем
На берег речки Беседь
В школьный сад
А людн шли
Под дулом автоматов
С причитаньем: "ох!" да "ах!"
У всех на спинах –
Жёлтые заплаты,
Испуг и безысходность в их глазах.
Несли мужчины
На плечах лопаты
И каждый - хмур,
С заплаканным лицом.
И били их
Немецкие солдаты
Прикладами, дубинками, свинцом…
...Вблизи от нас
Два свежих котлована
Зияли жуткой,
Мрачной глубиной.
И в этот час проклятый,
Самый чёрный,
Рыдали люди,
Плыл над садом гам.
Сгоняли к котлованам
Обречённых
И ставили в ряды
По берегам.
Шумели грозно
Липы вековые
И долго, долго
Пир кровавый шёл.
И падали сражённые,
Живые,
Красивый и мужской
И женский пол.
И корчились евреи
В яме в муках;
Смеялась зло карателей толпа.
Потом живым
Лопаты дали в руки
И приказали мёртвых закопать.
Затем и тех в сторонке
расстреляли...
Их даже не засыпали песком...

Нямецкія акупанты разрабавалі калгасы, пагналі жывёлу, расцягнулі фермы. Пагалоўна ў насельніцтва забіралі жывёлу, птушку, асабістыя рэчы. Акупанты знішчалі ўсё, што звязана з беларускай культурай.

На працягу двух з лішкам гадоў гітлераўцы спальвалі навакольныя вёскі: Чарняўку, Вітаву, Гуту, насельніцтва знішчалі, уганялі ў няволю.

Захопнікі ўгналі на катарту ў Германію больш сямісот хоцімскіх хлопцаў і дзяўчат. Сваімі зверствамі нямецкія вылюдкі імкнуліся падавіць волю савецкага народа да барацьбы і дабіцца рабскай пакорнасці. Але яны пралічыліся. Не хлебам і соллю, а куляй і гранатай сустрэлі савецкія людзі гітлераўскіх акупантаў.

Смела дзейнічаў пяцідзесяцітрохгадовы ляснік Яўціх Шавелька з пасёлка Самарска Бяседавіцкага сельсавета. Выдатна ведаючы тутэйшыя мясціны, ён то станавіўся партызанскім праваднікам, то выбіраў для іх зручныя стаянкі ў лесе, то ўводзіў паляваўшых за партызанамі карнікаў у балоцістыя багны і непраходныя нетры.

**Валянціна Баурына,**
**настаўніца гісторыі СШ № 1,**
**краязнаўца.**

Баурына, В. З гісторыі роднага краю : Да 55-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў / Валянціна Баурына // Шлях Кастрычніка. — 1999. — 25 чэрвеня. — С. 3.